# ПАЛАЖЭННЕ
# аб конкурсе маладых літаратараў «Маладзік»

---

1. Дадзеная Інструкцыя вызначае парадак арганізацыі і правядзення конкурсу маладых літаратараў «Маладзік» (далей – конкурс).

2. Мэтамі правядзення конкурсу з’яўляюцца:

- рэалізацыя дзяржаўнай палітыкі ў сферы выдавецкай дзейнасці;
- адкрыццё новых аўтараў у літаратуры;
- стымуляванне прафесійнага і мастацка-стылістычнага патэнцыялу маладых аўтараў;
- прадастаўленне маладым аўтарам магчымасці першай публікацыі;
- папулярызацыя кнігі і чытання ў грамадстве.

3. Конкурс праводзіцца штогод.

4. Арганізатарамі конкурсу з’яўляюцца Саюз пісьменнікаў Беларусі, выдавецкае рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства «Мастацкая літаратура», часопіс «Маладосць» (далей – арганізатары конкурсу), пры падтрымцы Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

5. Інфармацыя аб правядзенні конкурсу размяшчаецца ў часопісе “Маладосць”, у глабальнай камп’ютарнай сетцы Інтэрнэт, на афіцыйных сайтах арганізатараў конкурсу. Інфармацыя павінна ўтрымліваць звесткі аб часе, месцы правядзення конкурсу, умовах конкурсу, крытэрыях і парадку ацэнкі твораў удзельнікаў, парадку і тэрмінах аб’яўлення вынікаў конкурсу, формах узнагароджання, а таксама іншыя неабходныя звесткі.

6. У конкурсе могуць прымаць удзел грамадзяне Рэспублікі Беларусь, замежныя грамадзяне і асобы без грамадзянства, якія пастаянна пражываюць на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, ва ўзросце ад 18 да 35 гадоў уключна на момант падачы заяўкі (далей – удзельнікі конкурсу).

7. На конкурс прымаюцца паэтычныя і празаічныя творы (далей – творы) на беларускай, або рускай мовах, якія не публікаваліся раней і не ўдзельнічалі ў іншых конкурсах. Колькасць твораў, якія падаюцца на конкурс ад аднаго аўтара, не абмежавана, але іх агульны аб’ём не павінен перавышаць 120 000 знакаў – у жанры прозы, і 700 радкоў – у жанры паэзіі.

8. Адзін аўтар можа прымаць удзел у конкурсе не больш чым у адной намінацыі.

9. Разам з заяўкай на ўдзел у конкурсе удзельнік конкурсу накіроўвае:

- кароткую біяграфічную даведку;
- фотаздымак удзельніка конкурсу ў фармаце jpg (jpeg);
- твор (творы), афармлены ў рэдактары Microsoft Word у фармаце doc, шрыфт Times New Roman, памер шрыфта 14, міжрадковы інтэрвал 1,5, усе палі 2,5 см.

На тытульным лісце твора неабходна ўказаць: прозвішча, уласнае імя, імя па бацьку (калі такое маецца) удзельніка конкурсу, псеўданім (калі такі маецца), назву твора.

Матэрыялы прымаюцца на конкурс у электронным выглядзе па наступнаму адрасу электроннай пошты: glavred@mastlit.by.

Прыём заявак для ўдзелу ў конкурсе і твораў праводзіцца з 1 студзеня па 1 сакавіка года, у якім праводзіцца конкурс.

10. Матэрыялы, прадстаўленыя з парушэннем патрабаванняў, указаных у пункце 8 дадзенай Інструкцыі, да разгляду не прымаюцца.

11. Расходы, звязаныя з падрыхтоўкай і прадстаўленнем матэрыялаў на конкурс, аплочваюцца яго ўдзельнікамі самастойна.

12. Творы, якія паступілі на конкурс, не рэцэнзуюцца, не вяртаюцца.

13. Для ацэнкі твораў удзельнікаў конкурсу ствараецца журы ў колькасці васьмі чалавек. Склад журы зацвярджаецца Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Склад журы фарміруецца з прадстаўнікоў органаў дзяржаўнага кіравання, Саюза пісьменнікаў Беларусі, арганізацый, якія ажыццяўляюць выдавецкую дзейнасць, рэдакцый сродкаў масавай інфармацыі.

У склад журы не могуць уваходзіць аўтары твораў, якія ўдзельнічаюць у конкурсе.

Журы ўзначальвае старшыня.

14. Пасяджэнне журы лічыцца правамоцным, калі ў ім прымае ўдзел не менш як дзве трэці членаў экспертнага савета.

У спрэчных выпадках рашаючым з’яўляецца голас старшыні журы.

Ацэнка твораў удзельнікаў конкурсу ажыццяўляецца па дзесяцібальнай сістэме ацэнкі.

15. Пры ацэнцы твораў, якія паступілі на конкурс, членамі журы ўлічваюцца:
- літаратурны змест;
- стылістычнае і моўнае майстэрства;
- арыгінальнасць вобразнай сістэмы твора;
- пісьменнасць.

16. Пераможцамі прызнаюцца тры паэты (першае, другое і трэцяе месца) і тры празаікі (першае, другое і трэцяе месца), чые творы набралі найбольшую колькасць балаў.

Рашэнне аб пераможцах конкурсу афармляецца пратаколам.

Спіс пераможцаў конкурсу размяшчаюцца ў глабальнай камп'ютарнай сетцы Інтэрнэт на афіцыйных сайтах арганізатараў конкурсу.

Вынікі конкурсу абвяшчаюцца ва ўрачыстай абстаноўцы на Мінскай міжнароднай кніжнай выставе-кірмашы, пасля чаго змяшчаюцца ў адным бліжэйшых нумароў часопіса «Маладосць».

Пераможцы конкурсу атрымліваюць дыпломы Саюза пісьменнікаў Беларусі. Творы пераможцаў конкурсу публікуюцца ў штогадовым альманаху «Маладзік» (выдавецтва «Мастацкая літаратура»).